Пролетарыі ўсіх краін, аднаўцеся

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 195 (267) | Серада 26 жніўня 1940 г. | Цана 10 кап.

У ПРУЖАНСКІМ РАЁНЕ ПАЧАЛАСЯ СЯЎБА АЗІМЫХ

26 жніўня калгас імені Сталіна першым ў раёне пасеяў 10 гектараў жита.

27 жніўня прыступіў да сяўбы азімых калгас „Большавік". Сяўба праводзіцца высокаякасна з захаваннем ўсіх правіл агратэхнікі. Пушчана ў ход радковая сеялка. Глеба пад азімыя угноена торфам і гноем. Калгаснікі абавязаліся правесці сяўбу на плошчы 250 гектараў за 4 дні.

Да дня вызвалення Заходняй Беларусі ад іга польскіх п[illegible] калгаснікі гэтых калгасаў [illegible] дуць з поўным завяршэн[illegible] ўсіх сельскагаспадарчых рабо[illegible]

Комуністычная мараль і выхаванне моладзі

Выступаючы на III з'ездзе комсамола, Ленін патрабаваў, каб уся справа выхавання і адукацыі моладзі была падпарадкавана задачы выхавання ў ёй комуністычнай маралі, бо „ў аснове комуністычнай маральнасці ляжыць барацьба за ўмацаванне і завяршэнне комунізма". Ленін заклікаў юнакоў і дзяўчат паказваць прыклады комуністычнай арганізаванасці і дысцыпліванасці, прыклады свядомых комуністычных адносін да вучобы, да працы.

Цэлае пакаленне у нашай краіне вырасла ўжо ў новых грамадскіх умовах. Людзі, якім зараз ідзе трэці дзесятак год, не ведалі буржуазных адносін, не работалі у цяжкіх умовах капіталізма. У краіне Совецтаў знішчаны прычыны, якія пабуджаюць пры капіталізме маладога чалавека з-за страху за свой лёс рабалепствацца перад багатым і знатным, жыць хлусцёй і ліслівасцю, выбіваюцца напраўдай у людзі, жыць па воўчаму закону канкуренцыі. У нашай краіне моладзь мае права на асвету, на працу, на адпачынак. Ні адна краіна не прыцягвае сваю моладзь да рознабаковай дзяржаўнай работы, не прадастаўляе ёй такую паўнату грамадзянскіх праў, як соцыялістычная краіна. На клопаты партыі і ўрада аб ёй моладзь адказвае гарачай самаадданай работай і барацьбой на карысць соцыялістычнай радзімы, адказвае беззаветнай адданасцю справе комунізма.

Духоўная рыса маладога пакалення краіны Совецтаў — у яго вернасці прынцыпам комуністычнай маралі. Працавітасць, чэснасць, скромнасць, калектывізм, павага друг к другу, беззаветная адданасць радзіме, гатоўнасць афіяраваць сабою ў імя радзімы — гэтыя рысы вызначаюць аблічча маладога чалавека нашага часу. Такія рысы мы бачым у людзях, увасабляючых маладое пакаленне сталінскай эпохі: у Стаханаве, у калгасніцы Марыі Дземчанка, у героях Хасана і Карэльскага перашэйка. Гэтыя людзі на дзесяць галоў вышэй буржуазнага чалавека. Іх маральнасць узвышана і благародна.

Ворагі комуністаў прыпісвалі нам адчужэнне ўсякай маральнасці. Яны папракалі комуністаў у разбурэнні маральных устояў. Гэтыя папрокі комуністы ўспрымаюць як пахвалу сабе, бо комуністы нанеслі сакрушальныя ўдары этыцы крамніка і фабрыканта, папа і памешчыка, якія сваю вузка-класавую эксплаататарскую мараль спрабавалі і спрабуюць навязаць усяму чалавецтву. Большавікі вялі і вядуць упартую і жорсткую барацьбу з буржуазнымі перажыткамі ў сазнанні людзей, з „радзімымі плямамі" капіталізма. Чым мацней і сільней становіцца наша краіна, тым больш востра і непрымірыма адносіцца наша грамадства да ядавітай спадчыны мінулага, да рэшткаў буржуазнай, кулацкай і мяшчанскай ідэалогіі і маралі.

У совецкім грамадстве выкоўваецца новая мараль, якая сапраўды можа стаць агульначалавечай, бо комуністы з'яўляюцца наследнікамі вялікіх перадавых ідэй, накопленых чалавецтвам. „Мараль сапраўды чалавечая, якая стаіць вышэй класавых супярэчнасцей і усялякіх успамінаў аб іх стане магчымай толькі на такой ступені развіцця грамадства, калі не толькі будзе знішчана процілегласць класаў, але і згладзіцца ўсякія ўспаміны аб ёй у практычным жыцці", — гаворыць Ф. Энгельс. Ужо сёння большавікі паспяхова змагаюцца за такую мараль, стваральную трывалую аснову для яе.

Нашай моладзі, выхоўваемай партыяй Леніна-Сталіна, арганічна чужды дармаедства, распушчанасць, супроцьстаўленне асабістых выгад інтарэсам грамадства. Вось чаму наша моладзь з такім энтузіязмам сустрэла законы совецкай дзяржавы, накіраваныя на ўмацаванне дысцыпліны працы, на барацьбу з дэзарганізатарамі соцыялістычнай вытворчасці, з жулікамі і хуліганамі. Моладзь ведае, што гэтыя законы вызначаны задачамі барацьбы за комунізм, высокімі патрабаваннямі нашай маральнасці. Перадавая частка моладзі зрабіла для сябе правільны вывад з гэтых законаў. Яна не толькі павышае прадукцыйнасць працы ў вытворчасці. Яна павышае этычныя патрабаванні да сябе.

У совецкай моладзі ўжо даўно не карыстаецца крэдытам ні мяшчанскі ідэал „прыгожага жыцця", ні наскрозь буржуазная тэорыя „свабоднай любві", ні рамантыка п'янага разгула. Не рэалістычнай карцінай жыцця нашай моладзі, а карыкатурай і пашквілям на яе з'яўляюцца такія, з дазволу сказаць, творы кіномастацтва, як фальшывы фільм „Закон жыцця", які атрымаў рэзка адмоўную ацэнку совецкай грамадскасці, альбо мелкатраўчатая белетрыстыка, у якой пад выглядам комсамольцаў часам выступаюць пераліцаваныя героі Арцыбашэва. Совецкай моладзі нікольскі не ўласцівы з'явы маральнай распушчанасці. Гэта — рэдкая з'ява. Але нават адзіночныя выпадкі такога роду не могуць быць цярпімы.

Ленасць, дармаедства, лодырнічанне, хуліганства, палавая распушчанасць павінны быць вытраўлены да канца. Між тым некаторыя комсамольскія арганізацыі, сутыкаючыся з парушэннямі соцыялістычнай маралі, сутыкаючыся з фактамі лодырнічання, хуліганства, займалі пазіцыі абароны, гэта значыць пазіцыю пазіцыі. Не абарона, а наступленне патрэбна зараз! Сілу гэтага наступлення павінны адчуць лодыр, злодзей, хуліган.

Калі на механічным заводзе ў Яраслаўлі абмяркоўваўся Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, усе чэсныя рабочыя горача падтрымалі гэты Указ, а комсамолец Гудкоў выступіў наперакор ім са сваім сцвярджэннем аб неміпучасці прагулаў. Правільна паступіла комсамольская арганізацыя, якая выключыла гэтага новаўведзенага „тэарэтыка" з радоў комсамола.

Не можа быць двух думак у ацэнцы асобы комсамольца, які дазваляе сабе ігнараваць соцыялістычную дысцыпліну працы, ідзе на прагул, супроцьстаўляе свой асабісты інтарэс грамадскай справе. Таксама не можа быць двух думак у ацэнцы комсамольца, маладога чалавека, які робіць хуліганскі ўчынак. Калі комсамолец Сураў, студэнт 4 курса Казанскага юрыдычнага інстытута, п'яным з'явіўся [illegible] грамадскім месцы, дебашыр[illegible] [illegible]ынера, — трэба бы[illegible] [illegible]нуць хулігана [illegible] трэба здзіўляцца п[illegible] торых аднакашні[illegible]

Сураў прадстаў перад судом, асобныя студэнты выступалі ў якасці яго адвакатаў. Права-ж для сваёй абарончай практыкі будучыя юрысты маглі-б выбраць аб'ект зусім іншага роду.

Совецкая дзяржава зацікаўлена ва ўмацаванні сям'і. Стварыць трывалую совецкую сям'ю — абавязак моладзі. Комсамольскія арганізацыі абавязаны змагацца з адмоўнымі з'явамі, разбуральнымі сям'ю, з традыцыямі і звычкамі, якія засталіся ў спадчыну ад мінулага. Напрыклад, як закаспелы прыгоннік, а не як комсамолец выглядзіць сакратар комсамольскай арганізацыі калгаса імені Калініна, Ісфарынскага раёна Таджыкістана, Якубаў, які парадаваў жонку дарагім падарункам... атласнай парандзкой. Гэты ўчынак комсамольца выглядае асабліва дзіка на фоне масавага руху жанчын супроць паранджы.

Разлажыўшыяся і распусціўшыяся людзі падвізаюцца там, дзе яшчэ падспудна жыве падсунутая у свой час моладзі ворагамі народа подлая тэарыйка аб неўмяшанні калектыва ў асабістае жыццё, аб раздзельным існаванні асабістага быту маладога чалавека ад яго грамадскага быцця. Паводзіны чалавека ў сям'і, у быту не могуць не цікавіць арганізацыю, калектыў. Комуністы і комсамольцы зусім не супроць асабістага жыцця—любві, пяшчотнасці, дружбы. Ханжаству, маралізму, залішняму капанню у дробязях, вядома, не павінна быць месца. Але ў той жа час усёй сілай грамадскага праўзрэння і рэвалюцыйнага закона трэба абрушыцца супроць тых, хто расхіствае, апашляе ўстої комуністычнай маралі, хто ў быту пляміць імя комуніста, комсамольца, большавіка.

Самае важнае і высокае патрабаванне, якое краіна прад'яўляе да нашай моладзі,—быць у пастаяннай гатоўнасці са зброяй у руках абараняць родную краіну. Гутарка ідзе аб патрыятычным доўгу маладога чалавека перад яго соцыялістычнай бацькаўшчынай. Навучаючыся ў школе, працуючы на заводзе, у калгасе, ён павінен ні на мінуту не забываць аб тым, што радзіма можа пазваць яго са зброяй у руках абараняць яе незалежнасць, чэсць і славу. Быць заўсёды напагатове, ведаць ваенную спецыяльнасць, умець валодаць баявай зброяй, выхоўваць у сабе гераічныя якасці — пенахісную волю, храбрасць, мужнасць, скеласць, стойкасць у абароне радзімы, — значыць выконваць свяшчэнную запаведзь грамадзяніна.

Мы жывём у эпоху барацьбы двух светаў — капіталізма і соцыялізма. Мы заняты будоўляй комуністычнага будынка. Барацьба за пабудову комунізма ідзе ў складанай міжнароднай абстаноўцы, якая патрабуе ад нас мабілізацыйнай гатоўнасці, адмаўлення ад залішняга, суровай дысцыпліны і большавіцкай арганізаванасці. Стыль нашага жыцця павінен быць простым і строгім. Усё, што перашкаджае вялікай гістарычнай справе народа, павінна быць вымецена з вялікага совецкага дома. У барацьбе за чыстату ў гэтым доме, за творчую працу, за комуністычную маральнасць, якой вучаць нас Ленін і Сталін, комсамол павінен заняць падабаючае яму вялікае месца.

(Перадавы артыкул „Правды" за 27 жніўня).

Дзень вызвалення сустрэнем дэтэрміновым выкананнем хлебапаставак

Забыліся аб першым абавязку

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР у сваёй пастанове „Аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў" абавязаў партыйныя, совецкія, комсамольскія, земельныя і загатоўчыя органы шырока мабілізаваць масы калгаснікаў, работнікаў МТС, соўгасаў і загатоўчага апарата на своечасовае правядзенне ўборачных работ і на выкананне дзяржаўных планаў загатовак ва ўстаноўленыя ўрадам тэрміны.

Між тым кіраўнікі асобных раёнаў не сур'ёзна, фармальна адносяцца да выканання хлебапаставак. Да ліку самых адстаючых раёнаў, якія ганебна цягнуць нашу абласць назад, адносяцца Косаўскі, Поразаўскі, Камянецкі, Антопальскі і другія.

У гэтых раёнах не вядзецца масава-растлумачальная работа аб значэнні своечасовага выканання абавязацельстваў перад дзяржавай. У Бярэзненскім, Кудлянскім, Аніскавіцкім сельсоветах, Антопальскага раёна, пастанова ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР „Аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў" не даведзена да сазнання кожнага працоўнага аднаасобніка. У выніку да 22 жніўня ні адна гаспадарка вёскі Выгада, Аніскавіцкага сельсовета, не прыступала да выканання абавязацельстваў па хлебапастаўках. У вёсцы Соўплі толькі 3 гаспадаркі з 24 здалі хлеб дзяржаве.

Ёсць і такія факты, калі ўборку ўраджаю закончылі, а да абмалоту яго не прыступаюць. Аднаасобнікі вёскі Кустовічы, Кастрычніцкага сельсовета, Германюк Владзімір, Залетчук Сямён, Крыштафовіч Філіп, Крашчук Іван і іншыя маюць ад 25 да 30 гектараў зямлі кожны. Усе яны даўно закончылі ўборку зернавых, але да абмалоту не прыступаюць з тым, каб наўмысля зацягнуць хлебаздачу.

У асобных вёсках раёна астаткі варожых элементаў імкнуцца сарваць своечасовае выкананне плана хлебапаставак. У вёсцы Аніскавічы дзейнічае група баптыстаў, якой кіруе нейкі Бычык Фёдар. Ён дзейнічае адкрыта і варожа настроен да дзяржаўных мерапрыемстваў.

Прамы абавязак усіх партыйных і совецкіх арганізацый [illegible] рашучую барацьбу з тымі, хто будзе зрываць выкананне першэйшай задачы — хлебаздачы дзяржаве.

А. Кацубо.

92 процанты плана

Працоўныя Дамачэўскага раёна змагаюцца за першынства ў вобласці па выкананню абавязковых хлебапаставак. У сельсоветах і вёсках разгарнулася масава-палітычная работа па дастойнай сустрэчы гадавіны вызвалення з-пад [illegible]а гнёту датэрміновым раз[illegible]м па абавязацельствах перад дзяржавай.

Уперадзе падрыхтоў[illegible] свята [illegible] Чарнужскі сельс[illegible] 25 жніўня выканаў [illegible] тавак па 92 процанты.

Старшыня сельсовета т. Галя[illegible] Сільвестр, намеснік старш[illegible] т. Лобач Даніл і агент раён[illegible] ўпаўнаркамзага т. Спевок Мен[illegible] растлумачваюць хлебаздатчы[illegible] закон аб хлебапастаўках, арга[illegible]зоўваюць узаемадапамогу ўдова[illegible] і бясконы[illegible]

Член сельсовета т. М[illegible]чук Іосіф на сваім кані адвёз на базу Загот[illegible]о хлеб для Палагеі Кулік. Прыкладу Машчука пас[illegible] т. Мелянонак Павел і ад[illegible] хлеб удавы Гонжа [illegible]ніды.

НАРАДА СЕЛЬСКАГА АКТЫВА

У Сошыцкім сельсавеце, Бярозаўскага раёна, адбылася нарада сельскага актыва 12 вёсак.

Нарада абмеркавала пытанне аб выкананні плана паставак зярна дзяржаве. Большасць вёсак сельсовета абавязалася да 17 верасня поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па загатоўках хлеба. Свой абавязак яны выконваюць.

Самай адстаючай вёскай па выкананню загатовак і ўплаце падатку з'яўляецца вёска Радчыцы.

В. Гмыр.

Няма арганізаванасці на п[illegible]ым пункце

На прие[illegible]ным пункце „Заготзярно" ў Ж[illegible]чы зараз гарачая пара, ідзе м[illegible]савая здача сялянамі хлеба дзяржаве. Гэта патрабуе ад работн[illegible]каў, працуючых на прыёмачным пункце чоткасці і арганізаванасці ў рабоце. Аднак, на жаль, гэтага не зразумелі работнікі Жабінкаўскага прыёмачнага пункта.

Селяніну, які прыехаў на здатачны пункт, перш за ўсё прыходзіцца прастаяць доўгі час у чарзе. Работнікі прыёмачнага пункта, якія выпісваюць квітанцыі на прынятае збожжа, перабліваюць прозвішчы і імёны здатчыкаў. На справядлівыя заўвагі здатчыкаў яны нязменна адказваюць грубасцю. І. Вясюк.

[illegible]ылі малацьбу жыта

[illegible]існікі калгаса „Зара", Бяро[illegible]роза, [illegible]ага раёна, рыхтуюць дастойную сус[illegible]чу першай гадавіне з дня [illegible]ення працоўных Заходняй [illegible]усі ад іга польскіх пан[illegible]

Калг[illegible] кончыў малацьбу ж[illegible] план хлебапаста-в[illegible]

[illegible]хтуецца да [illegible] з і глеба для [illegible]хтавацы. Да [illegible] верасня [illegible]ся закончыць [illegible] работы.

[illegible]здзены вялікія [illegible]. За адзін год [illegible] канцылярыя, [illegible]ар. будуецца [illegible] Чэпко Вавіль.

[illegible]тнераў памідораў з гектара

ДНЕПРАПЯТРОЎСК. (ТАСС). У калгасе „Чырвоны факел", Селанянскага раёна, вырашчан небывалы ўраджай памідораў — 1.600 центнераў з гектара. Расада высаджвалася загушчаным спосабам — да 80 тысяч раслін на гектар. Гэта рэзультаты знатнага агародніка Александропальскай МТС, удзельніка Усе[illegible] Сельскагаспадарчай Выстаўкі Д[illegible] Ён збірае на працягу [illegible]ніх трох год рэкордныя ўраджаі памідораў—у сярэднім тысячу центнераў з гектара.

На сходзе актыва Кобрынскай партарганізацыі

24 жніўня ў Кобрыне адбыўся раённы сход партыйнага актыва Кобрынскай арганізацыі.

Даклад аб выніках работы ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б) зрабіў сакратар райкома партыі тав. Аронаў.

Дакладчык, адзначыўшы выключна важнае палітычнае і гаспадарчае значэнне рашэнняў пленума ЦК ВКП(б), падверг крытыцы работу совецкіх і гаспадарчых устаноў раёна і іх кіраўнікоў за дрэнную арганізацыю хлебапаставак і маруднае правядзенне ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

Загатоўчыя арганізацыі, райвыканком і райземаддзел з вялікім спазненнем прыступілі да арганізацыі работы па абавязковых пастаўках зярна дзяржаве. На сённешні дзень план хлебапаставак па раёну выканан толькі на 32,6 процанта. Асабліва адстаюць па хлебаздачы Казішчанскі і Тэвельскі сельсоветы, якія на 24 жніўня ледзь дасягнулі 16 процантаў выканання плана. Прымацаваныя да [illegible]ых сельсоветаў комуністы [illegible]ыраванікаў, Рамановіч і Паўляк сярод насельніцтва масава-растлумачальнай работы на праводзяць, займ[illegible] гастраляр[illegible]вам.

Д[illegible] падрыхтаваліся да прые[illegible] хлеба і работнікі раённай [illegible]торы „Заг[illegible]рно" (дыр[illegible]ктар [illegible]). Ля свірна [illegible]ькі гадзін [illegible] коіроўшчыкі [illegible] са сваёй [illegible]ае аболу-[illegible]каў не арга-[illegible]чальнай ма-[illegible] райканторы [illegible] рыхтуюцца [illegible] Тут яшчэ [illegible]ылі будаў-[illegible]ывалі ў па-[illegible] захавання [illegible]

Гаворачы аб ажыццяўленні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, тав. Аронаў адзначыў, што ў Кобрыне кіраўнікі многіх прадпрыемстваў і ўстаноў сустрэлі новы закон аб соцыялістычнай працы, як чарговую кампанію, а райком партыі і первічныя партыйныя арганізацыі самаўхіліліся ад кантроля над правядзеннем у жыццё Указа.

Больш месяца, напрыклад, пасля рашэння народнага суда марынавалася справа кандыдата партыі Шлеймовіч. Первічная партарганізацыя горхарчгандлю зусім не абмяркоўвала пытанне аб прагульшчыцы. Толькі пасля ўмяшання ў гэту справу абкома партыі Шлеймовіч была выключана з радоў партыі.

Дырэктар друкарні газеты „Труд" Літвін ушоў 29 чэрвеня ў камунальны аддзел па пытанню ўласнай кватэры і спазніўся на работу на гадзіну. Прайшло ўжо больш паўтара месяца, а прагульшчык яшчэ і зараз не прыцягнут да адказнасці.

Патураюць прагульшчыкам і лодырам кіраўнікі машына-трактарнай станцыі тт. Іваземцаў і Пукач. Тут трактарыстка комсамолка Каробачкіна спазнілася на 30 мінут. Тав. Іваземцаў ніяк не адважыцца накіраваць матэрыял аб прагульшчыцы Каробачкінай у суд.

Сын дырэктара МТС т. Іваземцава, працуючы шоферам, два дні не працаваў, нібыта па прычынах хваробы. З таго часу прайшло ўжо 15 дзён, даведка аб хваробе не прадстаўлена, меры да прагульшчыка не прымаюцца.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступіўшыя таварышы Бобрык, Таранаў, Гарохавік, Кацман і другія крытыкавалі райком партыі за ліберальныя адносіны да кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў і сакратароў первічных партыйных арганізацый, якія патуралі прагульшчыкам і лодырам.

У спрэчках таксама было адзначана, што раённая пракуратура вельмі марудна разглядала справы прагульшчыкаў і дэзарганізатараў вытворчасці, не займалася праверкай становішча працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах і ўстановах.

Выступленні раённага пракурора т. Чэмаданава і народн[illegible] [illegible] Энціна былі не сам[illegible]рытычнымі. Яны не сказалі канкрэтна, чаму ў пракуратуры і народным судзе залежваюцца справы прагульшчыкаў, зацягваецца выкананне вынесеных прыгавораў.

Партыйны актыў застаўся незадаволеным выступленнем другога сакратара райкома партыі тав. Слабодчэнка, які не мог прывесці ні аднаго канкрэтнага прыклада, як партыйныя арганізацыі кіруюць ходам выканання хлебапаставак і рэалізацыяй Указа.

У канцы схода выступіў сакратар абласнога камітэта партыі тав. Сікорскі. Ён укрыў рад сур'ёзных недахопаў у рабоце партыйных арганізацый, паставіў рад практычных задач, выцякаючых з рашэнняў ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б).

У спрэчках па дакладу выступіла 10 чалавек.

Сход актыва адобрыў рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і намеціў практычныя мерапрыемствы па паспяховаму завяршэнню ўборкі, правядзенню загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў і няўхільнаму выкананню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

Ермалаеў Т. А.

КАМЮНІКЕ

Змешаная камісія, створаная на аснове пагаднення Молатаў — Того ад 9 чэрвеня і Лавоўскі — [illegible]го ад 18 ліпеня з упаўнаважаных Мангольскай Народнай Рэспублікі і Манчжоу-Го, — пачала свае работы ў г. Чы[illegible] [illegible] 1940 года.

Усяго было праведз[illegible] [illegible]джэнняў, якія далі ра[illegible]зультаты. За гэты[illegible] [illegible]ва мелі месца на[illegible] [illegible]таў-эксперт[illegible] [illegible]разумен[illegible] [illegible]пра[illegible]

Надзвычайная

РЫГА, 26 [illegible] Сёння ў 12 гадзі[illegible] другое пасяджэнн[illegible] Вярхоўнага Совета [illegible] ССР, на якім быў за[illegible]

Сельскагаспадарчая выстаўка ў Тарту

ТАРТУ (Эстонская ССР), 26-[illegible] жніўня (ТАСС). У Тарту адкрыл[illegible] сельскагаспадарчая выстаўка. [illegible]ршы дзень яе наведала 10 ты[illegible]лавек, учора 40 тысяч. На [illegible]ўцы з вялікім поспехам вы[illegible] ў ансамбль песні і пл[illegible] [illegible]онасцяжнага Балтый[illegible]а.

СТАЛІНСКАЕ ЗАД

Канал б... ...заў вызвалены народ

...ада злу... выканана

...трас СССР ...Бугскі канал. ...ная область з ...ам водным шля... ...морам. Цяжка ацаэканамічнае і куль... ...е Днепра-Бугскага ...одаў заходніх аб... ...кія сталі свабод... ...і таму назад ад яр... ...ноў. Днепра-Бугскі ...ь сялянам-беларусам. Палесся, пакут... ...н-вякоў ад беззя... ...ць сотні тысяч гек... ...ных балот і пера... ...пладародныя ...нікаю вялізна... ...сцов ... ...ялікіх ляс... ...овых бу... ...нал ажы... ...ці... ...ка... ...украін... ...ынамі і ...арамі ...

...ваў вызвалены народ ...ада злу... ...выканана ...трас СССР ...Бугскі канал. ...ная область з ...ам водным шля... ...морам. Цяжка ацаэканамічнае і куль... ...е Днепра-Бугскага ...одаў заходніх аб... ...кія сталі свабод... ...і таму назад ад яр... ...ноў. Днепра-Бугскі ...ь сялянам-беларусам. Палесся, пакут... ...н-вякоў ад беззя... ...ць сотні тысяч гек... ...ных балот і пера... ...пладародныя ...нікаю вялізна... ...сцов ... ...ялікіх ляс... ...овых бу... ...нал ажы... ...ці... ...ка... ...украін... ...ынамі і ...арамі ...

...ны ...ная ...ам ...ка... ...ка... ...ка...

94
187

АННЕ ВЫКАНАНА

ьніка ўчастка

лы. Сяляне ўходзілі на палявыя работы. І тут мы зноў падумалі над пытаннем замацавання кадраў. Стварылі неабходныя ўмовы для работы. Палепшылі грамадскае харчаванне, арганізавалі выплату грошай па месцу работы.

Гета ўсё дало станоўчыя вынікі нам за месяц удалося дагнаць перадавыя вузлы і атрымаць премію ад наркома.

Дэпутат на будаўніцтве

Несумненна, што вялікую і дзейсную дапамогу ў хутчэйшым сканчэнні будаўніцтва аказалі партыйныя і совецкія арганізацыі абласці — дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і БССР.

Сакратар Дзвінскага райкома партыі тав. Кавалёў і старшыня райвыканкома тав. Лапацін самі займаліся пытаннем забеспячэння нашага ўчастка рабочай сілай. І патрэбна прызнацца, што дзвінцы адыгралі рашаючую ролю ў паспяховым завяршэнні работы.

Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Пацяруха паўтара месяца знаходзіўся на будаўніцтве. Ён ушкаў ва ўсе дэталі работы, быў сярод будаўнікоў, адмячаў нашы недахопы і ўказваў шляхі для выпраўлення іх.

Таварыш Пацяруха заваяваў вялікую павагу і любоў рабочых канала. Ён з'явіўся ініцыятарам і арганізатарам соцыялістычнага спаборніцтва.

Вытворчасць і аб'ём работ

Па нашаму ўчастку было вынята: 205.094 кубічных метраў грунта, 54.099 кубічных метраў падсыпкі, 46.500 квадратных метраў пад планіроўку. Адзярнована 8.590 квадратных метраў берагоў. У землю забіта тысячы свай і шпунтаў.

Усе гэтыя работы ў большасці праводзіліся ручным спосабам. Земляныя работы пад галавы шлюзаў толькі на 20 процантаў былі выкананы экскаватарам.

Асабліва на рубцы ражэй нашы цесляры апракінулі ўсе старыя тэхнічныя нормы і за 36 гадзін пры добрай якасці работы склалі ражы на 6 гідравузле. За тры тыдні быў пабудаван чатырохкватэрны дом і кантора.

Усяго на будаўніцтве затрачана 195.860 чалавека-дзён і 17.227 коня-дзён.

* *

7 жніўня прайшоў першы караван суднаў. Наша задача выканана. Канал пабудаван.

В. Лузін.

РАСКАВАНЫЯ РУКІ

Калі ў мяне пыталі: „Аляксандр, на што ты багаты?" — я заўсёды адказваў: „На рукі". І сапраўды рукі мае—адзінае багацце. Я бяднейшы з бяднейшых, у якога ніколі не было ні кала, ні двара, заўсёды спадзяваўся толькі на тое, што я магу заработаць, спадзяваўся на свае рукі. Але яны былі закаваны кайданамі. Свой кароткі век я толькі і марыў, каб мець работу, любую работу, за якую можна будзе мець хоць кавалачак чорствага хлеба для маіх галодных дзяцей.

Ураджаю з аднаго морга пасчанай зямлі — пахатнай і сенажаці—нехапала нават на некалькі месяцаў жыцця. І я зімой і летам, у мароз і спякоту заўсёды шукаў работы. Летам працаваў на шасе, у памешчыка, зімой малаціў хлеб кулакам, быў на лесасеках. Работаў ад цёмнага да цёмнага і за сваю цяжкую працу атрымліваў столькі-ж, колькі даюць жабраку. З аднаго злотага ў дзень плаці падаткі, штрафы, вучы дзяцей, наймай каня на апрацоўку зямлі.

Цяжка было жыць пры белапольскіх панах!

Новымі выдатнымі гарызонтамі адкрылася будучыня, калі доблесная Чырвоная Армія раскавала ад кайданоў рукі. Гэтымі свабоднымі рукамі хочацца рабо-таць, не шкадуючы сваіх сіл на карысць радзімы, каб адплаціць за шчасце і выдатныя правы, якімі мы карыстаемся.

Я радавы земляко. Работаю на канале з першага дня да яго пуска. Будаўніцтва канала стала для мяне роднай, блізкай справай. Ніколі не перабіраў работу. Працаваў там, куды ставілі, працаваў там, дзе многія не хацелі працаваць. І заўсёды і ўсюды я перавыконваў нормы, паказваў прыклады ў рабоце.

Апошнія дні работы на будаўніцтве, сазнанне таго, што мы выканалі вялікае заданне правадыра, натхніла мяне на яшчэ лепшую стахановскую работу.

20 жніўня я на 400 процантаў выканаў сваё дзённае заданне, вывазіўшы тачкай 20 кубічных метраў зямлі.

У гэтыя шчаслівыя мінуты, калі воды спакойнага Мухавца і Піны плывуць па каналу, мне хочацца ад усёй душы сказаць:

— Прымі, правадыр, наш першы падарунак. Мы абяцаем табе яшчэ лепш працаваць пад тваім геніяльным кіраўніцтвам.

Дземенюк А. Г.,
селянін вёскі Камень-Каралеўскі.

Выдатнае збудаванне

Я бязмежна шчаслівы, што мне першаму ўдалося правесці караван суднаў з Пінска ў Брэст.

Першы рейс па новаму Днепра-Бугскаму каналу на...ніў нас, рачнікоў, на яшчэ лепшую работу, каб справай аддзякаваць таварышу Сталіну за клопаты аб рачным транспарце.

Па ўсёй трасе канала я не сходзіў з капітанскага мосціка. І маё сэрца радавалася новай выдатнай перамогай вызваленага народа.

Днепра-Бугскі канал—выдатнае збудаванне сталінскай эпохі.

Ганчароў,
капітан-настаўнік.

Мухавец стаў суднаходнай ракой. Першы кацер, які прайшоў па Днепра-Бугскаму каналу.

Жанчыны-закапёршчыцы

Пад гнётам польскіх паноў беларуская жанчына была яшчэ больш прыгнечана, чым мужчына. Усе жахі капіталістычнага прыгнечання ў першую чаргу падалі на жанчыну. Мы эксплаатаваліся памешчыкамі, куланамі, а многія былі рабынямі сваіх мужоў. Толькі ад часу да часу больш шчаслівым з нас пападалася работа, за якую плацілі вельмі нізкую плату.

З прыходам Чырвонай Арміі . вызваліцельніцы, калі на раней прыгнечанай зямлі заззяла сонца Сталінскай Канстытуцыі, раскаваліся нашы рукі, зняты з іх кайданы, і жанчына - рабыня стала свабоднай, роўнапраўнай.

Я глыбока адчула сваё роўнапраўе і ў мяне з'явілася ўпэўненасць у сабе, жаданне працаваць, будаваць у адказ на вызваленне.

З мяне смяяліся жанчыны, што я іду работаць на канал. „Зямлю капаць — не бабская справа",—гаварылі яны. Але я не паслухала іх. На кпіны адказвала стахановскай работай у катлаванне.

З першых дзён прыбыцця на канал я паставіла перад сабой мету: не ўступіць мужчынам у любой рабоце. І я не ўступала. А пасля, калі пачалася забіўка свай і нехапала рабочай сілы, я прапанавала начальніку гідравузла арганізаваць жаночую брыгаду закапёршчыкаў. І тут было не без здзеку некаторых мужчын, якія смяяліся, што мы і поўбаі не заб'ём за дзень. А жанчыны адказалі: „Смяецца той, хто смяецца апошні. Час пакажа".

І час паказаў. На цяжкай мужчынскай рабоце мы работалі не горш, чым другія капрывныя брыгады.

Я заўсёды падбадзёрвала сваіх дзяўчат. У першыя дні мы ў два разы выконвалі норму.

Забіваючы сваі ў зямлю для будучага шлюза, мы закладвалі фундамент шчасця радаснае жыццё, пад сваё шчасце. Вось чаму цяжкая работа ішла так лёгка і складна.

Па сканчэнню капрывых работ мы зноў перайшлі на земляныя работы. Мая брыгада забіла першыя сваі і яна пасадзіла першыя кветкі на берагах і адкосах канала.

М. Камінарук.

6 гідравузел, в. Гуткі, Кобрынскага р-на.

Сіла соцыялістычнага спаборніцтва

Канал Выгода—Кобрын даўжынёй у 24 кілометры спрамляе водны шлях ад Дняпра да Буга на 13 кілометраў і сваімі размерамі поўнасцю забяспечвае праход суднаў. . . .

Траса канала праходзіць па забалочанай мясцовасці, большая частка якой раней была непрахадзімай. Торф, суглінак, гліна — вось грунты, па якіх праводзілася работа.

Тэрміны будаўніцтва былі надзвычайна жароткімі, а аб'ём земляных работ велізарны. Дастаткова сказаць, што на працягу двух з паловай месяцаў неабходна было вынаць больш мільёна кубічных метраў зямлі, спланіраваць 5 мільёнаў квадратных метраў адкосаў і бічаўнікоў.

Па складзенаму намі графіку, работы на канале праводзіліся такім чынам. Наперадзе шлі ўзрыўнікі, якія пракладвалі шлях для землясосаў. Услед за ўзрыўшчыкамі вытваралася ручная распрацоўка грунта, а за імі рухаліся тры магутныя землясосы. Затым плывучы экскаватар завяршаў увесь працэс механізацыі. За экскаватарамі вытваралася планіроўка адкосаў і бічаўнікоў.

Некаторыя сяляне акаляючых вёсак спачатку вельмі неахвотна шлі на будаўніцтва. Была распаўсюджана думка, што мы не пабудуем канал. Свае сцвярджэнні яны падмацоўвалі тым, што пры беспрыкладным на працягу 4 год работала маса зняволеных і канала не пабудавалі.

Невялікая група комуністаў і комсамольцаў, першымі прыбыўшая на будаўніцтва, не спужалася цяжкасцей. Яны пашлі ў вёскі, праводзілі сходы, расказвалі аб вопыце каналабудаўніцтва ў Совецкім Саюзе. Масава-растлумачальная работа неўзабаве дала свае плады. Нявераўшых у магчымасць пабудовы канала з кожным днём станавілася ўсё менш і менш. На будаўніцтва канала пайшлі сотні і тысячы сялян. Не гледзячы на моцныя марозы, мяцеліцы, работа на канале разгортвалася поўным ходам. Прыходзілася работаць у ледзяной вадзе. Ад вады, наступаўшай зверху, рабочыя абараніліся земляными валамі, а падглебавую ваду, якая залівала канал, адлівалі вёдрамі.

Велізарную работу прарабілі рабочыя ўзрыўнікі. Яны ўзарвалі 250 тысяч кубаметраў зямлі ў цаліне. Бывалі дні, калі дзесяткі тысяч кубаметраў зямлі ўзляталі ў паветра. Узрыўнымі работамі на канале кіраваў комуніст тав. Ф. І. Філатаў. Мясцовае насельніцтва не было падрыхтавана да гэтай работы, яно нават баялася падыходзіць да ўзрыўных матэрыялаў. Працэс прыгатаўлення зарадаў, асмолка іх, прыгатаванне пека — брудная работа, за якую ніхто не хацеў брацца.

Усю гэту работу выконваў сам тав. Філатаў, і сваім асабістым прыкладам заахвочваў другіх. Калі першыя два дні па гэтай рабоце знаходзілася ўсяго 3—5 чалавек, то праз тыдзень— другі тут ужо работала звыш 500 чалавек. Тав. Філатаў вучыў прафесіі ўзрыўнікаў многіх рабочых. На яго ініцыятыве былі створаны кароткатэрміновыя курсы ўзрыўнікаў. Іх скончыла 12 чалавек. З гэтага ліку 8 узрыўнікаў з мясцовага насельніцтва.

Масу зямлі, ўзнятую ўзрывамі з дна канала, убіраў першы землякаравана. Да работы на нашым канале рабочым землякаравана прыходзілася здымаць перакаты на ўсіх, намываць пляцоўкі для будаўніцтва заводаў. А тут ім упершыню прышлося прагрызаць канал у цаліне. Не гледзячы на гэта людзі і механізмы работалі выдатна.

Для забеспячэння нармальнай работы землякопаў прыходзілася будаваць па ўсёй даўжыні канала з абодвух бакоў два рады магутных земляных валаў з устанаўленнем драўляных шчытоў для таго, каб грунт, які выкачваюць землясосы, не пападаў зноў у канал.

Бывалі моманты, калі валы не ў стане былі затрымаць магутны струмень землясосаў. У такіх выпадках лепшыя людзі канала, работаючыя тут з самага пачатку будаўніцтва, кідаліся ў ваду па пояс і ратавалі валы ад разбурэння. Да ліку такіх самаадданых людзей нашай будоўлі адносяцца перш за ўсё тт. Гольдман Маша, Охман Малка, Охман Інда, Грыцук Вера, Дзенесюк Надзя, Шыш Маня і іншыя дзяўчаты і хлопцы з вёскі Мехведавічы, Антопальскага раёна. Яны сваім прыкладам заахвочвалі ўсіх будаўнікоў.

Мы імкнуліся заўсёды к таму, каб добрыя прыклады асобных рабочых, брыгад, агрэгатаў былі даведзены да ўсяго калектыва будаўнікоў. З гэтай метай мы штодзённа праводзілі кароткія вытворчыя нарады, на якіх расказвалася аб выніках рабочага дня, аб людзях і іх паказчыках. Аб метадах работы перадавых людзей пісалася ў насценных газетах, іх паказчыкі заносіліся на дошкі ўчота соцыялістычнага спаборніцтва.

Соцыялістычнае спаборніцтва было шырока разгорнута на будаўніцтве. Спаборнічалі ўсе: брыгады з брыгадамі, агрэгаты з агрэгатамі, рабочы[illegible] Вось жанчына Х[illegible] вёскі Гірок, Антоні[illegible] працуючы на адн[illegible] штодзённа выконвал[illegible] на 250—300 процант[illegible] ядыстычнае спабор[illegible] клікала мужчын і з[illegible] ішла ўпарадзе. На 25[illegible] выконваў дзённую но[illegible] з мястэчка Гарадн[illegible] Ку[illegible]

Добра спраўляўся [illegible] работай землясос № 24 (начальнік Падгорны, помпаліт Паўлаў). Ён увесь час трымаў [illegible] раходны чырвоны сцяг будаўніцтва.

Аб самаадданасці і гераізме людзей гэтага каравана гаворацъ такія прыклады. Перакладка якарэй у балоцістай мясцовасці— справа вельмі складаная. Матрос каравана тав. Патапчэнка прапанаваў зрабіць шчыты, якія клаліся на балота і па іх цягнулі якар, як на санках. Каб дастаць якар, далёка ўшоўшы ў дрыгву, тав. Патапчэнка ныраў у балота і там нагамі зацапляў трос за лапы якара, а потым паднімалі яго лябёдкай.

Выдатнымі арганізатарамі паказалі сябе члены партыі: прараб тав. Белкіна, Гудрагелаў і начальнік забеспячэння тав. Левін. Усе яны, не лічачыся з часам, днём і ноччу ў любое надвор'е кіравалі людзьмі, дапамагалі ім парадай, указаннямі. У дадатак да ўсяго гэтага яны былі добрымі грамадскімі работнікамі на вузле. Душой нашага калектыва заўсёды былі комуністы і комсамольцы. На выкананне самых цяжкіх і складаных работ яны ішлі першымі, паказвалі там узоры самаадданасці і снароўкі і тым самым заахвочвалі тысячную армію будаўнікоў канала на стахановскую работу.

Будаўніцтва канала ў асноўным закончана, па яго трасе ўжо ходзяць судны, гружаныя хлебам і іншымі таварамі. Нам яшчэ прадстаіць правесці значную работу па паглыбленню фарватара, адзярнёўцы адкосаў. Прымяняючы метады соцыялістычнага спаборніцтва, апіраючыся на ініцыятыву перадавых людзей, мы і гэтымі работамі справімся з чэсцю.

М. Д. Офштайн,
начальнік будаўніцтва канала Выгода—Кобрын, орденаносец-інжынер.

Перавозка грузаў

З Кіева, Одэсы, Пінска па Дняпру, Прыпяці, праз [illegible] трасу Днепра - Бугскага канала рухаюцца караваны суднаў з хлебам, прамысловымі таварамі ў пагранічны горад Брэст.

З 9 жніўня да апошніх дзён прыстань Брэст прыняла з [illegible]ванаў суднаў, якія прывезлі 1.500 тон розных грузаў.

— Дзядзька Сцяпан, а ці памятаеце вы вечар перад калядамі, калі мы ўпершыню гаварылі аб тым, што патрэбна ісці будаваць канал? — хітравата спытаў Васіль.

— Ты хочаш сказаць, пляменнік, што я неахвотна ішоў работаць на вузел?

Адгадаў. Не толькі сам не хацеў ісці работаць, і Івана не пускаў. І, перадразніваючы, Вася пачаў крыўляцца са старога: „Мне нездаровіцца, пара на той свет ужо старому, не магу работаць, нават у гаспадарцы стаў слабы. Іван не пойдзе, дома работы хопіць.

— Ну што-ж такога, — ухмыляючыся заўважыў стары. Цёмны я быў, не разумеў, не ведаў важнасці і, праўду кажучы, не верыў, што так хутка можна пабудаваць канал.

* *

Ля чысценькага, невялікага домика, які падслепаватымі, маленькімі вокнамі глядзіць на поўдзень, дародная, маладая жанчына Аляксандра Герасімаўна чакала з работы мужа і свёкра. Памінутна яна выбягала за ваколіцу і, пільна ўглядваючыся ў далечыню, шукала на дарозе знаёмыя і дарагія сілуэты людзей. Колькі бессонных начэй і трывожных дзён [illegible] вяла за гэты[illegible] 7 мес[illegible] перацярпела яна з[illegible] даў і суседак. Дзе[illegible] піла, яе ўсюды п[illegible] ды смяяліся.

— Алеся, ма[illegible] дуць і не на[illegible] Іван там, на канале[illegible] здружыўся. Пісьмен[illegible] разумная, праменяў канал, на тую совецку[illegible]

А калі гэта не дапамагала, не дзейнічала на сялянку, яны пачыналі з другога боку.

— Ну дзе-ж гэта бачна, каб баба, ды яшчэ на парах, можна сказаць, сама арала, гной вазіла, ды яшчэ гаспадарку вяла! Ці-ж гэта ўсё бабская справа? Эх, шкода нам цябе, Алеся, разбітае ў цябе жыццё, а маладая ты, прыгожая. Ці не можаш ты прымусіць свайго Івана, каб ён дома работаў, а не за грашы на канале ..

Кулацкія падпявалы на розныя матывы і ўсімі сп[illegible]лі імкнуліся сарваць будаў[illegible]. Яны ўгаварвалі чесных, ад[illegible] не работаць на канале. [illegible] стараннасць шэбрынсва[illegible] прылажылі да таго, каб [illegible] з будаўніцтва Носіка з [illegible] нам, гэтых слаўных арганізатар[illegible] і брыгадзіраў, важакоў сял[illegible] якія карысталіся такім аўтары[illegible] там сярод будаўнікоў.

— Раз Носік кіне работу, значыць, усе шэбрынцы кінуць, —думалі кулакі.

Але Носікавых было цяжка з'агітаваць. Яны ўсёй душой аддаліся будаўніцтву і звязалі з ім сваё жыццё. Тады кулакі выбр[illegible] лі другі шлях —падзейнічаць [illegible] жонку Івана, Аляксандру.

І нашэптыванні баб усё[illegible] дзейнічалі на Алесю. Ад[illegible] гэта пераносіла моў[illegible] [illegible]окардзячы[illegible] [illegible]азоў Алеся [illegible] Іван[illegible]

сардэчнай цеплыні, што ў Алесі ў горле застанаўліваліся недасказаныя словы.

А Іван, добра разумеючы цяжкае становішча жонкі, гаварыў ёй:

— Нічога, Аляксандра, хутка, хутка скончым канал, тады адпачнём. Я ведаю, дарагая, што табе цяжка.

І забывала Алеся нашэптванні баб.

Задоўга да світання, калі праз заінелыя сцёклы вакон ледзь-ледзь прабіваўся цмяны свет месяца і адбіваў на сценах хаты вялізную печ, Алеся ўставала цішенька, каб не разбудзіць мужа, і [illegible]ыхтавала снеданне. Укладвала [illegible] невялікую торбачку сала з хлебам — абед на дарогу. А вечарам, калі абветраны, замёрзшы Іван прыязджаў з далёкага і цяжкага шляху, яна выпрагала каня, [illegible]іла яго, адцірала Івану аб[illegible] [illegible]цы, шчокі і рукі.

[illegible]нем вясны, калі [illegible] зямлі, на [illegible]

З дрыўлянага ложку паднялася старуха і жартаўліва пачала папракаць мужа.

— Ой, стары, напэўна прамяняў мяне на барышню, позна дамоў пачаў прыходзіць.

— А па-твойму, я яшчэ магу спадабацца?— таксама жартам адказаў ён.

Вячэра праходзіла ажыўлена. Бацька дзяліўся ўражаннямі рабочага дня, расказаў аб тым, што ён сёння атрымаў премію — адрэз на касцюм, падлічваў свае заработкі за перыяд будаўніцтва.

У хаце стала горача, і Іван расчыніў вокны на вуліцу. З ракі пацягнула лёгкім подыхам ветра. Даносіўся гул земляных караванаў, ачышчаючых фарватэр Мухаўца. Усе накіравалі погляды на раку, туды, дзе ў такі позні час работалі машыны і людзі пры свеце электрычных ліхтароў, якія міг[illegible] зоркі.

[illegible]ўся сынішка. Іван пя[illegible] ўзяў яго на рукі і паднёс яго да вакна.

— Ну, Іван Іванавіч, дышы свежай паветрай, любуйся жыццём. Хто ведае, можа праз дзесяткі год пад гордым совецкім сцягам ты праплывеш капітанам карабля па гэтаму каналу, які будавала наша сям'я разам з тысячамі будаўнікоў.

— Хопіць табе, Іван. Пойдзем маляціць, заўтра хлеб патрэбна здаваць дзяржаве, — звярнуўся стары да сына.

— Лажыцеся адпачываць, тату, — адазвалася Алеся. — Я ўжо абмалаціла жыта, хопіць [illegible]жаве і сабе.

[illegible]цька і сын ласкава пагля[illegible] [illegible]а Алесю.

Я. Зарэцкі.

[illegible] в. Шэбрынь, Брэсцкі раён.

Група інструктароў парашутызма Зах. АВА. Злева направа: капітан Волкаў (мае 267 прыжкоў з парашутам), малодшы лейтэнант Сінельшчыкаў, малодшы камандзір Лукашын, ваентэхнік другога ранга Свабода, лейтэнант Орлоў, старшы лейтэнант Карабут. (Фотахроніка Белта).

Помнік загінуўшым байцам

Ля ўваходу ў гарадскі парк імені 1 Мая стаіць вялікая магіла, дзе пахавана 48 адважных патрыётаў нашай радзімы — байцоў, загінуўшых у баях за вызваленне народаў Заходняй Беларусі з-пад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Працоўныя Брэста свята ўшанаваюць памяць аб слаўных сынах працоўнага народа, аддаўшых жыццё за іх вызваленне. Зверху на магіле ставіцца вялікі помнік героям-байцам. Помнік будуе вышынёй у сем з паловай метраў, ён будзе мець форму пірамідальнага абеліска. Наверсе помніка — пяцікапцовая звязда з чырвонага мрамара, унізе — чырвоная мрамарная дошка з імёнамі пахаваных герояў.

Адкрыццё помніка адбудзецца ў дзень святкавання гадавіны вызвалення працоўных Заходняй Беларусі — 17 верасня.

Помнік будуецца па праекту інжынера Чыж. Скульптурныя работы выконвае настаўнік 12 школы т. Зайдэнцвейг.

Перадавое сельпо

Добра пастаўлена работа крамы Лыпчыцкага сельскага спажывецкага таварыства, Брэсцкага раёна. На ўсіх крамах ... Работа ... культурна, ... Лыпіцы ...

... на гэтаму сельпо ... 79,9 процанта, а па загатоўцы ... — на 121 процант.

... работы ў крамах вылучаецца ... Яновыя сяляне, якія на ... спаўляюцца з сваімі абавязкамі. Вось у краме № 7 працуе ... Саладая даяўчына тав. Мацюк. Яна навяла ў краме паўзорны парадак і чыстату, да пакупнікоў заўсёды адносіцца ветліва.

Чесна працуе старшыня сельпо тов. Пупко. Ён кожны дзень бывае ... на вялікую работу сярод пайшчыкаў аб задачах спажыўкааперацыі.

Треба адзначыць, што за ўсіх крамах гэтага сельпо ... дадатковай кольнасці тавары ... неабходнасці, ... тавары, ... ассортымент.

Праўленне сельпо і ўсе кладнікі ўзялі на сябе абавязацельства да 17 верасня — гадавіны вызвалення працоўных Заходняй Беларусі з-пад гнёту польскіх паноў — на 100 процантаў выканаць план III квартала па тавараабароту і закупках мяса, яек, воўны, оку ... г.д.

І. Летні.

Унеслі грошы па падпісцы на пазыку

... рабіцца пазыкі ... сабралі пазыкі суму па падпісцы. Таксама поўнасцю сабралі грошы па падпісцы ... Кацюшчыка, Кацюшчыка і Бытоўшчыка сельсаветаў тт. Кавальчук, Арахоўскі, Васілюк.

Міхальцоў.

... 200 тон торфу

... летам Кляшчэльскі ... камбінат арганізаваў здабычу торфу на балотах вакол ... Свежкі, Мілейчыцкага сельсавета. За паўтара месяца здабыто ... тон торфу. Лепшымі рабочымі ... здабычы торфу зарэкамендавалі сябе таварышы Еўгеній ... к, Сцяпан Дзем'яновіч і ... урсовіч. Яны выконвалі свае ... на здабычы торфу на 110 ... ...таў.

... ота, дзе праводзяцца раскопкі, вельмі багата торфам. ... лікам райпромкамбіната трэба ... ...лапаціцца аб тым, каб на ... год расшырыць работу па здабычы торфу.

А. Ватнік.

СХОД МОЛАДЗІ

... мі ў мястэчку Мілейчыцы, ... льскага раёна, у парадку ... ...тоўкі да Міжнароднага ... ага Дня ... быў праведзен ... оладзі. Больш 300 чалавек, ... шыхся ў Доме соцкультуры, ... халі змястоўны даклад аб ... ка-Сталінскім комсамоле. А. В.

...інофікацыя заходніх абласцей БССР

... СК. (ТАСС). На тэрыторыі ... Заходняй Беларусі налічваецца ... 56 стацыянарных кіноўстановак. За апошнія 11 месяцаў у ... х центрах абсталявана 50 стацыянарных кіноўстановак, ... везена 47 гукавых аўтакіно... ...вак, да канца года будзе ... дрэмантаваны і рэканструяваны ... 30 кінатэатраў. 22 калгасных кінатэатры адкрылісі пры ... соцыялістычнай культуры, ... да года колькасць іх дасягне ...

Англа-германская вайна

Зводка германскага камандвання

БЕРЛІН, 26 жніўня (ТАСС). Вярхоўнае камандванне германскай арміі перадае наступную зводку: „Капітан падводнай лодкі Рэзінг паведамляе аб затапленні ўзброеных гандлёвых параходаў праціўніка агульным водазмяшчэннем у 89 856 тон. Другой падводнай лодкай затоплены 4 гандлёвых параходы агульным водазмяшчэннем каля 30 тысяч тон.

Па дадатковых даных, у ноч на 25 жніўня падвергліся бамбардыроўцы 9 аэрадромаў, партовыя збудаванні, ваенныя заводы, чыгуначныя вузлы, пазіцыі зенітнай артылерыі ў 38 не ўпамінаўшыхся раней мясцовасцях Англіі.

Адбыліся пажары, моцныя ўзрывы ў партах Кардыф, Вей мут, у марскіх верфях Ньюкэсла, у прамысловых прадпрыемствах Біліньема і др. Гэтай ноччу над Англіяй усяго скінута 1500 бомб агульнай вагой каля 150 тысяч кілаграмаў.

У ноч на 26 жніўня германскія самалёты бамбардыравалі авіяцыйныя заводы і другія прадпрыемствы ваеннага значэння ў Бірмінгаме, Кінгстаўне, Ковентры. Былі заўважаны моцныя ўзрывы і шматлікія пажары. Агульныя страты непрыяцеля склалі ўчора 72 самалёты, германская авіяцыя страціла 14 самалётаў".

Дзеянні англійскай авіяцыі

ЛОНДАН, 26 жніўня (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе: „У ноч на 25 жніўня англійская авіяцыя атакавала ваенныя аб'екты ў Паўднёва-Заходняй Германіі, у тым ліку ў Франкфурце, Людвігсгафене і Штутгарце. Ва Францыі, Бельгіі, Галандыі і Германіі бамбардыраваны 7 аэрадромаў; бамбардыроўцы падвергся таксама Мілан, Сесто, Календэ, дзе знаходзяцца буйныя авіяцыйныя заводы. Усе самалёты вярнуліся на свае базы.

Па атрыманых сёння звестках, пацвярджаецца, што 24 жніўня было збіта 50 непрыяцельскіх і 19 нашых самалётаў.

Учора ў часе паветраных налётаў германскай авіяцыі на Англію знішчана 54 непрыяцельскіх самалёты, 13 англійскіх знішчальнікаў не вярнуліся на базы. У ноч на 26 жніўня германскія бамбардыроўшчыкі скінулі бомбы на паўночным усходзе Англіі і Шатландыі. У адным з гарадоў у цэнтры краіны ад бамбардыроўкі пацярпелі прамысловыя прадпрыемствы, у другім горадзе атрымалі пашкоджанні тэатр і некалькі магазінаў.

Адзіночны непрыяцельскі самалёт скінуў сёння раніцай бомбы над Лонданам; забіты два паліцэйскіх, адна бомба ўпала на галоўную гандлёвую вуліцу, выклікаўшы пажар у газаправодзе.

Бамбардыроўка Берліна

БЕРЛІН, 26 жніўня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што ў ноч на 26 жніўня над Берлінам праляцела некалькі непрыяцельскіх самалётаў, скінуўшых зажыгацельныя бомбы ў прыгарадах. Бомбы не прычынілі страт, адзін самалёт збіт.

Бамбардыроўка Бірмінгама

БЕРЛІН, 26 жніўня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што мінулай ... германская авіяцыя бамбардыравала ваенныя аб'екты Бірмінгама ... 20 бамбардыроўшчыкаў, ... жых скінуў груз бомб вагой паля тысячы кілаграмаў.

На ... бамбардыроўкі. Усыхнулі шматлікія пажары. Месцы бамбардыроўкі сфатаграфіраваны.

Паветраныя баі над графствам Кент

БЕРЛІН, 26 жніўня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе: „Над графствам Кент (Англія) адбываюцца жорсткія баі паміж германскімі і англійскімі знішчальнікамі, адначасова германскія бамбардыро... ... бардзіроўкі ... Англіі ... ская зенітная артылерыя бяздзейнічае.

Страты англічан, па папярэдніх даных, складаюць у сярэднім 10 самалётаў на кожны 2 ... манскіх самалётаў. ... гэтага часу ... страты склалі ... англійскіх самалётаў на кожны 2 германскіх самалёты".

Германская нота Англіі

... 26 жніўня (ТАСС). Агенцтва Трансацеан паведамляе: ... 23 жніўня германскі ... перадаў Англіі ... Урад ноту, у якой ... , што англійскія лётчыкі парушаюць міжнародныя правілы, абстрэльваючы германскія выратоўчыя самалёты ... Германскі ўрад заяўляе, што ён ... прымае ... асаходныя меры. У ноце прыводзіцца рад выпадкаў абстрэла германскіх выратоўчых самалётаў англійскімі знішчальнікамі.

АМЕРЫКА УЗБРОЙВАЕЦЦА

„...Пытанне аб перадзеле калоній набывае ўсё большую вастрыню. Імперыялістычныя апетыты растуць не толькі ў далёкай Японіі, але і ў Злучаных Штатах Амерыкі, у якой не мала ахвотнікаў прыкрываць свае імперыялістычныя планы рэкламнымі „клопатамі" аб інтарэсах усяго „Заходняга поўшар'я", якое гэтыя паны гатовы зрабіць сваёй уласнасцю са ўсімі яго многалікімі рэспублікамі і каланіяльнымі ўладаннямі іншых краін на прылягаючых да амерыканскага мацерыка астравах. Усё гэта нясе небяспеку далейшага расшырэння і далейшага распальвання вайны, з ператварэннем яе ў сусветную імперыялістычную вайну".

Гэтыя словы таварыша В. М. Молатава, сказаныя ім у дакладзе на VII Сесіі Вярхоўнага Савета СССР, як нельга лепш і дакладна растлумачваюць сапраўдныя прычыны той ліхарадкі ўзбраення, якая ахапіла ў апошні час Злучаныя Штаты Амерыкі (ЗША). Ніколі яшчэ Амерыка не ведала такога грандыёзнага размаху ваенных падрыхтаванняў, як зараз.

Ваенна-марскі флот ЗША павялічваецца на 70%. Праграма ваенна-марскіх узбраенняў прадугледжвае пабудову 200 ваенных караблёў агульным водазмяшчэннем у 1 мільён 325 тысяч тон.

Яшчэ больш здзіўляюць тыя планы, якія намячаюцца і часткова ўжо ажыццяўляюцца ў авіяцыйнай прамысловасці. Ваеннае міністэрства ЗША намерана давесці паветраныя сілы ЗША да 50 тысяч самалётаў першай лініі.

Падрыхтаванні такога-ж размаху вядуцца па ўсіх відах узбраенняў, пачынаючы ад размяшчэння велізарных заказаў на танкі, артылерыю і інш. На гэту праграму ўзбраенняў у ЗША ўжо асігнавана 9 мільярдаў даляраў. Але дадатковыя сметы не спыняюць паступаць, і невядома, якіх грандыёзных лічбаў дасягнуць ваенныя выдаткі.

Пашыраюцца прадпрыемствы, выпускаючыя ваенную прадукцыю. Будуюцца новыя заводы, якія павінны павялічыць вытворчасць самалётаў, танкаў, снарадаў і інш.

Ваенныя выдаткі выклікаюць павышэнне падаткаў, якія лажацца цяжарам на шырокія масы насельніцтва. Армія беспрацоўных у ЗША складае 10 — 12 мільёнаў чалавек. Усе грамадскія работы для беспрацоўных адменены. У буйнейшых цэнтрах (Нью-Йорк, Чыкага) настаўнікі за ... месяцаў не атрымоў... ботнай платы. Вялікае не... нение сярод амерыканскага народа парадзіў праект увядзення абавязковай воінскай павіннасці, якой да гэтага часу ў ЗША ў мірны час ніколі не было. Згодна праекта, да адбыцця воінскай павіннасці ў першую чаргу павінны прыцягвацца нежанатыя маладыя людзі. І вось амерыканскі друк адзначае дзіўную з'яву: ва многіх штатах за апошнія тыдні падвоілася і нават патроілася супрэ... нормы колькасць шлюбаў.

Мноства мітынгаў, арганізаваных па ўсёй краіне, рашуча выказваюцца супроць ваенных ... рыхтаванняў, у якіх масы вядзіва бачаць прамы... да вайны. Рэзалюцыі ... шых аб'яднанняў профсаюзаў прама заяўляюць, што вядучыя падрыхтаванні — не што іншае, як падрыхтоўка да захопніцкіх войн.

ЗША фармальна не ўдзельнічаюць у вайне, але фактычна актыўна дапамагаюць Англіі самалётамі, маторамі, танкамі і другім ваенным снаряжэннем. Ваеннае супрацоўніцтва ЗША з Англіяй даходзіць да таго, што Англія перадае Злучаным Штатам Амерыкі накаторыя свае ўладанні за Атлантычным акіянам для стварэння на іх амерыканскіх ваенна-марскіх і ваенна-паветраных баз. Больш таго, зараз гутарка ідзе аб прамым ваенным саюзе паміж ЗША і Канадай, уваходзячай у састаў Брытанскай імперыі. Як вядома, Канада (размешчана ў Паўночнай Амерыцы) знаходзіцца ў стане вайны з Германіяй.

Да пачатку сучаснай ... імперыялістычнай вайны Ге... ...ванія бы... ...

Германскі друк аб совецкім павільёне на Лейпцыгскім кірмашы

БЕРЛІН, 26 жніўня (ТАСС). Германскі друк удзяляе вялікую ўвагу адкрыўшамуся ўчора Лейпцыгскаму кірмашу. Газета „Дойчэ алгемейне цейтунг" адзначае, што лік замежных пакупнікаў адразу перавысіў 5 тысяч чалавек. Асабліву ўвагу звяртае на сябе павільён Совецкага Саюза.

„Берлінер берзэнцейтунг" піша, што з усіх 22 замежных дзяржаў павільён Совецкага Саюза адзін з найбольш упутальных.

Газета „Нахтаусгабе" падкрэслівае, што ў кірмашы не гледзячы на ваенны час удзельнічае 6 126 розных фірм. Выстаўлены самыя разнародныя экспанаты. Асабліва прывабны павільён Совецкага Саюза, піша газета, ён надзвычайна афармлен і дае ўяўленне аб велізарных натуральных багацтвах краіны.

У совецкім павільёне дэманстрыруюцца не толькі паказчыкі сыравіны, але і прадукты харчовай прамысловасці, майстэрскі выкананыя вырабы з дрэва і фарфара. Далей прэзідэнт кірмашу Фіхтэ заявіў карэспандэнту ТАСС: „Совецкі павільён адрозніваецца сваёй рознастайнасцю, ён зроблен з вялікай любоўю, совецкая выстаўка мае поўны поспех і робіць вялікае ўражанне".

Павільён Совецкага Саюза, па водгуках наведвальнікаў, дае наглядное ўяўленне аб росце совецкай прамысловасці і багацтвах Совецкага Саюза. У кнізе запісаў наведвальнікі ахвотна пакідаюць шматлікія водгукі. Вось некаторыя з іх:

„Руская выстаўка дае поўную карціну багацця і магутнасці Совецкага Саюза".

„Выстаўка СССР надзвычайная".

Учора галоўны бургамістр Лейпцыга Фрэйберг зрабіў прыём з прычыны адкрыцця выстаўкі, на якім прысутнічаў паўпрэд СССР у Германіі таварыш Шкварцеў, а таксама супрацоўнікі совецкага гандлёвага прадстаўніцтва.

Поспех совецкага павільёна на міжнароднай выстаўцы ў Варне

САФІЯ, 26 жніўня (ТАСС). За тыдзень з дня адкрыцця міжнародную выстаўку ў Варне (Балгарыя), па папоўных даных, наведала звыш 70 тысяч чалавек. Велізарным поспехам карыстаецца совецкі павільён. Яго штодзённа наведваюць 7—8 тысяч чалавек, у асобныя дні — 15—18 тысяч чалавек.

Наведвальнікі з велізарным інтарэсам знаёмяцца з экспанатамі і ўважліва разглядваюць совецкія электраматоры, трансфарматары, рэжучыя вымяральныя прыборы, інструменты, электрарадыёлампы і г. д.

На верцячымся стэндзе паказаны совецкія шарыкападшыпнікі розных размераў, у многалікіх дыяграмах адлюстравана магутнасць цяжкай прамысловасці СССР.

Штодзённа наведвальнікі пакідаюць у кнізе водгукаў аб совецкім павільёне 300—350 запісаў, у большасці выпадкаў захапляючых.

Вечарам дэманстрыруюцца совецкія кінофільмы, прыцягваючыя да 20 тысяч гледачоў. Дэманстраваліся фільмы „Трактарысты", „Чапаеў", „Знішчальнікі", „Чацьверты перыскоп".

Балгарскі і венгерскі друк аб гадавіне совецка-германскага пакта аб ненападзе

САФІЯ, 26 жніўня (ТАСС). Балгарскія газеты змяшчаюць рад артыкулаў, прысвечаных гадавіне совецка-германскага пагавора аб ненападзе. Газета „Зара" ... артыкул Топора ... , у якім гаворыцца: „Першым ... результатам з'яўляецца ... ахова міру і бесспрэчна ... расшырэнне гандлёвых і ... еўрапейскімі дзяржавамі.

Прайшоўшы з моманту падпісання германа-совецкага пагавора год з ... , пакт ... , што пакт з'яўляецца ... , сродкам міру і мірнага вырашэння спорных пытанняў паміж народамі. Мы, балгары, маем усе падставы шчыра і глыбока радавацца, што гэта імкненне так ...

БУДАПЕШТ, 26 жніўня (ТАСС). Венгерскі друк шырока адгукваецца на гадавіну ... ...скае гадавіны. Адзначаючы беспрэцэдэнтны ... ...ны ... СССР і Германіі, газета „Мад'ярорсаг" піша: „З часу сусветнай вайны яшчэ не было такога ... ...дзеяння ... ...ны ...

... ...ны ... дадатніх вынікаў, чым усе папяровыя дагаворы дзяржаў-пераможцаў".

„Руска-германскі пакт, — піша газета „Мад'ярарсаг", — прынёс велізарную карысць усёй Еўропе. Ён не дапусціў узнікнення вайны ва Усходняй Еўропе, якая пацягнула-б за сабой каласальныя спустошэнні".

„Мы, венгры, — заяўляе газета „Пешці Хірлап", — непасрэдна зацікаўлены ў пакце, бо краіны паўднёвага ўсходу, у тым ліку і Венгрыя, абавязаны яму захаваннем міра".

Паведамленне італьянскага камандвання

РЫМ, 26 жніўня (ТАСС). Італьянскае камандванне перадае наступную зводку: „Нашы паветраныя злучэнні зноў бамбардыравалі марскую базу ў Александрыі.

Адна з падводных лодак, аперуючых у атлантычным акіяне, сур'ёзна пашкодзіла вялікае нафтаналіўное судно праціўніка.

Ва Усходняй Афрыцы ў часе паветраных налётаў праціўніка на Могадзішо (Італьянскае Сомалі) ранена 4 чалавекі і на Галабат (Абісінія) забіта 6 салдат і каля 40 ранена, у Комбольча (Абісінія) ранена 15 салдат. Матэрыяльныя страты нязначныя".

Сутычка на граніцы Інда-Кітая

ШАНХАЙ, 26 жніўня (ТАСС). Як паведамляе газета „Даваньбао", ўчора пры спробе японскіх войск перайсці граніцу Інда-Кітая адбылася сутычка паміж японскімі і французскімі войскамі. Абстрэляныя артылерыяй і кулямётным агнём японцы адступілі.

По словах газеты, прадстаўнікі розных грамадскіх арганізацый Інда-Кітая звярнуліся да кітайскіх улад з просьбай паслаць у Інда-Кітай для сумеснай барацьбы супроць японцаў.

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКЕЎ

БРЭСЦКАМУ МЯСАКАМБІНАТУ НА БУДАЎНІЧЫЯ РАБОТЫ

ПАТРЭБНЫ:

каменщ... цесляры, рабочыя, ...ыкі.

...ртацца з 9 г. ... і вечара ў аддзел ...варыша Лосева, ...37, тэлеф. 1—77.

...раецца набор рабочых

...локіх і сямейных) на целюлозна-...ровыя прадпрыемствы Наркам-...лесапрома СССР.

Звяртацца: г. Брэст, Совецкая вул. д. № 110, тэлеф. № 183, і ў ...ённыя пункты абласці да вярбоўчыкаў Наркамлесапрома СССР.

СЁННЯ У КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-га МАЯ"

МОРЯКІ

Кінатэатр імені ГОРКАГА

АРСЕН

Брэсцкая музыкальная школа

КУПЛЯЕ

раялі, піяніны і другія музыкальныя інструменты.

Зварачвацца па адрасу: вул. Пушкінская, 22.

Дырэкцыя.

...увязі са скарачэннем будаўніцтва на гідравузле № 8,

Будаўнічая кантора ліквідуецца.

...яне, раней работаўшыя ... ...ку сваю ... з'яўляцца ... ...тых дні за ... ...

... сельскія ... вузле № 8, ... зарплаты.